Птушкі і Мы

№1 (26) 2015

Разам для прыроды і людзей



www.ptushki.org | www.birdwatch.by

Чырвоная кніга вакол нас


ФИАЛКА ТОПЯНАЯ
ФІЯЛКА БАГНАВАЯ
VIOLA ULIGINOSA BESS.


ОДНОЦВЕТКА ОДНОЦВЕТКОВАЯ
АДНАЦВЕТКА АДНАКВЕТКАВАЯ
MONESES UNIFLORA (L.) A.GRAY


ЛУННИК ОЖИВАЮЩИЙ
ЛУННІК АЖЫВАЮЧЫ
LUNARIA REDIVIVA L.


ЛАПЧАТКА БЕЛАЯ
ДУБРОЎКА БЕЛАЯ
POTENTILLA ALBA L.


ДРОК ГЕРМАНСКИЙ
ЖАЎТАЗЕЛЬ ГЕРМАНСКІ
GENISTA GERMANICA L.


ЧИНА ГЛАДКАЯ
ЧЫНА ГЛАДКАЯ
LATHYRUS LAEVIGATUS (WALDST. ET KIT.) GREN.


ШАЛФЕЙ ЛУГОВОЙ
ШАЛФЕЙ ЛУГАВЫ
SALVIA PRATENSIS L.


ВОДЯНОЙ ОРЕХ ПЛАВАЮЩИЙ (ЧИЛИМ)
ВАДЗЯНЫ АРЭХ ПЛАВАЮЧЫ (ЧЫЛІМ)
TRAPA NATANS L.S.L.


КУВШИНКА БЕЛАЯ
ГАРЛАЧЫК БЕЛЫ
NYMPHAEA ALBA L.


АРНИКА ГОРНАЯ
КУПАЛЬНІК ГОРНЫ
ARNICA MONTANA L.

Фота Аркадзя Скуратовіча, Дзмітрыя Дубовіка


Вокладка:
Звычайная туркаўка *(Streptopelia turtur)*
Фота Дзмітрыя Якубовіча

Галоўны рэдактар:
Аляксандр Вінчэўскі
Адказны рэдактар: Сяргей Зуёнак
Рэдакцыйная рада:
Алег Кальчанка
Аляксей Цішачкін
Віктар Фянчук
Вікторыя Церашонак
Ганна Трафімчук
Мікалай Чэркас
Вёрстка: Міхаіл Пракапенка

№ 1(26), 2015
Выходзіць з 1999 г.
Перыядычнасць 2 разы на год
наклад 1000 паас.
Рэгістрацыйны №727
ад 12.09.2009 г.
Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь

Наш адрас:
ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”,
вул. Парнікоая, 11, пам. 4,
220114, Мінск, Беларусь.
Тэл. (017) 263 01 30,
факс (017) 263 06 13.
E-mail: info@ptushki.org
www.ptushki.org

Для карэспандэнцыі
а/с 306, Мінск, 220050, Беларусь.
Дзейнасць
ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”
падтрымліваецца
Каралеўскім таварыствам аховы
птушак (RSPB), партнёрам BirdLife
International у Вялікабрытаніі.
ГА “Ахова птушак Бацькаўшчыны”
з'яўляецца афіцыйным партнёрам
BirdLife International у Беларусі.
Надрукавана ў друкарні
ООО «ПОЛИКРАФТ»,
Ліцэнзія № 02330/466 ад 21.04.2014 г.
Замова №







Паважаныя сябры,

вы трымаеце ў руках спецыяльны нумар часопіса АПБ, прысвечаны праекту “Аб'ядноўваемся вакол прыроды”, фінансаванага Еўрапейскім саюзам. Як вы разумееце, дзейнасць грамадскай прыродаахоўнай арганізацыі немагчымая без дапамогі мясцовага насельніцтва. З верасня 2014 года мы надавалі шмат увагі ўсходнім рэгіёнам Беларусі, і хацелі б падзяліцца некаторымі вынікамі нашай працы.

Мы правялі 40 матывацыйных сустрэч з удзелам больш за 700 чалавек, арганізавалі каля 100 тэматычных урокаў для вучняў Магілёўшчыны і Гомельшчыны, правялі 12 трэнінгаў для 208 настаўнікаў і навучылі іх карыстацца сайтам “Біяразнастайнасць Беларусі” (www.florafauna.by). Клубы “Крылаты дазор” арганізаваныя ў 98 адукацыйных установах і ўжо актыўна ўдзельнічаюць у кампаніях і акцыях АПБ. Вялікія надзеі звязаныя і з студэнтамі чатырох вышэйшых устаноў Гомеля, Магілёва, Горак і Мазыра. З ГГУ ім. Ф.Скарыны і МДПУ ім. Шамякіна мы падпісалі дамовы пра супрацоўніцтва.

Мы спадзяёмся, што матэрыялы гэтага выпуску будуць цікавымі і карыснымі як для нашых даўніх сяброў, так і для тых, хто толькі далучыўся да вялікай сям'і АПБ.

З пажаданнямі цёплага лета, поўнага на сустрэчы з птушкамі,
Аляксандр Вінчэўскі,
дырэктар АПБ і галоўны рэдактар ПіМ,
Кацярына Прысяжнюк,
менеджар праекта АПБ “Аб'ядноўваемся вакол прыроды”


Данное издание подготовлено в рамках проекта
ENPI/2012/305-884 "Объединяясь вокруг природы".
Проект реализуется ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны"
при финансовой поддержке Европейского союза.
За содержание издания несет ответственность
ГА "Ахова птушак Бацькаўшчыны", и ни при каких обстоятельствах оно не отражает позицию Европейского союза.

Михаил Никифоров: «Свой первый определитель птиц я сделал в 5-м классе»

Страничка из полевого дневника с описанием

О научных глубинах, жизни в лесу и гнезде зарянки в шкафу – в интервью с академиком НАН Беларуси, доктором биологических наук, профессором Михаилом Никифоровым.

Созвониться с Михаилом Ефимовичем мне удалось с шестого раза, а встретиться – и вовсе в выходной день. Вместе с коллективом он пришел на субботник, а после обеда около двух часов рассказывал мне про птиц: просто, понятно, на одном дыхании. И с неподдельной искоркой в глазах, которая с годами не тускнеет, а приобретает все новые оттенки. Уже через пять минут понимаешь: человек – на своем месте. Какое счастье встречать таких!

– Михаил Ефимович, Вы изучали птиц и в 80-х, и сейчас. Как изменилась белорусская орнитология за это время?

– Если говорить о науке, то пришло понимание того, что простые вещи уже достаточно изучены. И наблюдение за птицами с констатацией увиденного не есть сегодня наука, ибо это кто-то уже и увидел, и описал ранее. У чибиса гнездо на земле, сизоворонка питается насекомыми – это скорее познание птиц для самого себя. Если посмотреть литературу – все это известно. А наука – это создание новых знаний, открытие каких-то явлений, свойств или закономерностей. И вот наука в последние десятилетия стала более серьезной. Ученые погружаются в более глубокие вещи, исследования проводятся на молекулярном, генетическом уровне, с применением сложных технических средств и приборов.

– Какие достижения и результаты в орнитологии можно отметить?

– Разработана стратегия спасения и сохранения вертлявой камышовки – достижение, которое стало возможным благодаря сотрудничеству с зарубежными коллегами. Хорошие работы проведены по миграциям куликов, по большой выпи. На научной основе отсортированы виды для Красной книги, которые нужно взять под охрану. Много новой информации собрано по аистам, сейчас продолжается серьезная работа по большому подорлику. Можно брать фамилию любого орнитолога, который защитил диссертацию, и у каждого есть свои достижения. До этого были хорошие работы по тетеревиным, по хищникам. Я был научным руководителем работ восьми орнитологов, которые стали кандидатами наук: каждый поднял важные вопросы. Многие сейчас отмахиваются: зачем писать эти работы? Но именно это позволяет оставить свой след в истории орнитологии. И это будет как памятник исследователю: вопрос изучен.

– А если человек не хочет писать работы, но при этом помогает на своем уровне?

– Орнитологию можно разделить на два блока: серьезная наука и занятие птицами на уровне любительского наблюдения. Второе можно назвать орнитологией с натяжкой. Но именно такая работа помогает находить новые виды, отмечать изменения ареалов видов. Бердвотчеры создают базу для дальнейших научных обобщений, на своем уровне пытаются что-то делать, или работают в связке с учеными. Пример того, как наука и любители птиц под эгидой АПБ хорошо сработали вместе – это, опять-таки, работа по сохранению вертлявой камышовки. Стоит отметить и другие заслуги АПБ: Клуб-200, хранители ТВП, «Крылатые дозоры» школьников… Многим людям нравится природа, но они не знали, что можно сделать для ее пользы. АПБ рассказала, как можно помогать природе и при этом реализовывать себя.

«Чтобы редкие виды птиц не пошли по пути зубра»

– На что нужно обращать внимание современным орнитологам?

– Во многом работа орнитологов базируется на результатах мониторинга. Часто проблемы появляются внезапно: изменились условия – вид стал исчезать. Чем раньше узнаем – тем быстрее сможем принять меры, пока не наступило кризисное состояние. Например, почти исчезла сизоворонка, и никто не знает причин. Почти исчезла авдотка. Что делать? В силах ли мы удержать эту птицу? Изменяется окружающая среда, города разрастаются и захватывают все больше территорий у природы… В таком случае важно контролировать, чтобы количество территорий, где концентрируются редкие виды, не становилось меньше. Наша задача – сохранять птиц на уровне природных популяций, чтобы потом не пришлось их искусственно разводить, как сейчас происходит с зубром.

– Над чем еще стоит поработать?

– Опять сокращается численность тетеревиных птиц. В 90-х годах, когда многие поля были заброшены, зарастали, количество тетеревов увеличилось. Теперь снова падает.

Это конфликт птиц и развития сельского хозяйства: будет или одно, или другое. А чтобы, например, тетерев спокойно расхаживал по парку – такого никогда не произойдет. Есть много отдельных проблем, которые уменьшают количество птиц: загрязнение водоемов, зеркальные здания и прозрачные ограждения… Для выявления возможных угроз тоже нужен мониторинг.

Стоит сказать, что официально система мониторинга животного мира у нас в стране организована: наблюдения ведут ученые, сотрудники нацпарков и заповедников. Есть исследователи, которые изучают отдельные группы или виды. Есть центр, куда стекаются все данные, работает система анализа данных, что позволяет заметить проблемы. Но пока это все в очень ограниченном масштабе, и всегда есть к чему стремиться.



Михаил Никифоров – первый Президент АПБ (являлся Президентом АПБ на протяжении пяти лет, председателем АПБ на протяжении одного года, членом Центрального Совета АПБ – на протяжении девяти лет).

Участники восьмой Всесоюзной орнитологической конференции, 1981 год (слева направо: Михаил Никифоров, Петер Янков, Евгений Карев, Владимир Храбрый, Борис Яминский)

«Если сохраним беркута – сохраним и другие виды птиц»

– Что, на ваш взгляд, угрожает биоразнообразию Беларуси и как этого избежать?

– Нужно создавать условия, чтобы сохранялась, прежде всего, наиболее уязвимая часть биологического разнообразия, то есть редкие виды. На них, как известно, и сориентирована Красная книга. А среди редких еще выделяются так называемые флагманские виды – крупных размеров, привлекательные, символичные. ТВП направлены на такие флагманские виды, заказники создаются в местах их обитания. Если мы сохраним, например, беркута – то сохраним и многие другие виды в лесах и болотах.

– Достаточно ли людей задействовано в белорусской орнитологии?

– Всегда будет казаться, что мало. Но их столько, сколько есть. Нельзя заставить человека. Нужно не только привлекать людей, а заинтересовывать. Широкое освещение – залог успеха. Чем больше громких информационных акций – тем лучше. Именно из них молодой человек узнает, как поет соловей, и поет он прямо у него возле дома, узнает, что за кулик кричит на болоте и сколько там видов этих куликов. Увлечется – сам придет в науку.

«Увидел заросший Туровский луг – внутри такая утрата»

– Назовите одну-две, на Ваш взгляд, самые громкие «истории успеха» АПБ.

– Сейчас я не так плотно связан с работой АПБ, но всегда рад услышать об организации. Самой большой заслугой АПБ считаю массовые акции, которые привлекают широкий круг людей. «Базовые» достижения организации, я считаю, это бюллетень «Subbuteo», птица года в монетах, наклейках, фотоконкурсы, тот же ПиМ, Крылатый дозор, из более поздних – Фестиваль куликов, «Соловьиные вечера», спортивная орнитология, другие массовые мероприятия. Вывести людей в лес, показать птиц – это великолепно! Именно так воспитывается бережное отношение к природе, к птицам. Результаты научных проектов, которые проходили через АПБ, также очень важны: это и спасение Ельни, и работа на Туровском лугу. Я один из тех, кто видел этот луг раньше: там не было ни кустика. Вода, песок, трава – тундровый ландшафт. Потом долго не был в тех краях, а когда увидел, как все заросло – внутри такая утрата, как будто что-то ценное потерял. Уходит образ жизни, который поддерживал луга в благоприятном для птиц состоянии. И АПБ, и ученым важно продолжать работу на Туровском лугу, иначе мы можем утратить птиц открытых пойменных лугов.

– Какой Вы видите АПБ в ближайшие пару лет: на какие проекты стоит сделать упор, на что важнее обратить внимание?

– На эколого-просветительскую и воспитательную работу. Ниша общественных организаций – это работа со школьниками, студентами. Никто лучше вас не расскажет о такой области интересов, как природа, птицы. Вспомните, что происходит в школе: ботаника, зоология, все усреднено. А если придет АПБ – тематические занятия, плакаты, буклеты: интересно! Тогда дети будут знать названия птиц, как они выглядят, и что еще важнее – знать их проблемы. Или тот же фестиваль куликов: пока школьники готовят выступления, они проникаются. Надо любить природу и уметь работать с людьми: и с малышами, и с пенсионерами. Человек – существо социальное, он последует за вожаком. Если заинтересуется – то свяжет с природой свою жизнь, кто-то и в науку придет. А чем больше будет ученых – тем больше новых и более глубоких знаний.

«Белорусы – не самая культурная нация по отношению к природе»

– Белорусы любят природу?

– Есть люди, которые искренне переживают за природу. Но многие относятся к ней безобразно. Это факт, и это ни от кого не скроешь. Посмотрите на леса, на берега водоемов. Да, есть порывы собрать школьников, провести уборку. Но сказать, что все воодушевлены, нельзя. Жуткая ситуация и в дачных кооперативах. На своих участках у людей ни соринки. А за заборами – страшно посмотреть. Так что мы, видимо, не самая культурная нация по отношению к природе.

– Когда Вы видите такое, не опускаются ли руки в работе?

– Не скрываю: меня это очень расстраивает. Но в одночасье изменить ситуацию нельзя. Должен быть образец, мотивация. Должна вестись работа в детском саду, школе, в семье – тогда будет результат. Если не доходит внушение – применять наказание. Как сейчас за браконьерство: поймают охотника или рыболова за нарушение – штраф, мало не покажется. И это действует.

«Открыл энциклопедию – и меня зачаровало»

– Как и когда Вы увлеклись птицами?

– В серьезную науку, я думаю, приходят люди, которых я называю фанатиками. Выучиться на такого нельзя: фанатиками рождаются. У кого-то на первом месте самолеты, вертолеты, динозавры, а у кого-то – птицы. Меня с детства тянуло к природе. С 10 лет я жил, по сути, в лесу. Родители работали в санатории, и дом сотрудников был в лесу. Сначала очень привлекали растения, и вообще все живое. Оно ведь постоянно меняется!

– А как с растений перешли на птиц?

– У меня в школе был товарищ, заядлый голубевод. За компанию таскал меня по крышам и чердакам смотреть голубей. Там еще гнездились галки, воробьи, стрижи. Так я впервые увидел гнезда, яйца, как это все устроено. Стал смотреть и на других птиц. Но знаний


Школьные годы


Михаил Никифоров – директор ГНПО «НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам»

не хватало, пошел в библиотеку. Как открыл энциклопедию – меня зачаровало: такое разнообразие!

После этого я стал не просто ходить по лесу, а искать гнезда. И этот поиск меня увлек.

– Как Вы учили виды птиц?

– Я уже в школьном возрасте решил, что нужно сделать какой-то определитель птиц. У нас в санаторской библиотеке такого не было. Взял общую тетрадь, разрезал и сделал из нее блокнот. Стал собирать информацию, зарисовывал птицу, гнездо, размеры. Потом обратил внимание, какие у птиц разные клювы, стал зарисовывать и их. Кое-что переписывал в свой определитель из других книг.

– Сколько Вам было лет?

– Точно не помню, думаю, пятый класс. Тогда растения отошли на второй план, и я окончательно увлекся птицами. Скоро в ближайшем лесу мне стало тесно. Все птицы были знакомы, и я не мог понять: а где остальные виды, о которых пишут в книгах? Стал ходить все дальше от дома. К примеру, когда нашел гнездо камышницы, было такое счастье, как будто нашел гнездо райской птицы! Такие яркие моменты из детства остаются в памяти на всю жизнь. Конечно, тогда я не думал ни про поступление в вуз, ни уж тем более про науку. Просто хотел сделать определитель, чтобы знать птиц.

– Сколько птиц умещал Ваш школьный определитель?

– Тяжело сейчас вспомнить, под сотню птиц было. И это помогло мне в будущем. Школьные опыты чуть позже, в студенческие годы, переросли в новую общую тетрадь. Именно на этих страницах развернулась подготовка к созданию определителя «Птицы Белоруссии». Так собирался материал, здесь мои наблюдения с 1976 года. В 1989 году это вылилось в книгу «Птицы Белоруссии: справочник-определитель гнезд и яиц». Потом мы создали в Институте зоологии банк данных, стали заносить все на карточки, и необходимость в этой тетради отпала. Тут все зачеркнуто, когда переносил сведения, чтобы не внести данные дважды. Но выбросить тетрадь не поднялась рука. Даже переклеил обложку, чтобы сохранить.

«Над моим крыльцом гнездится снегирь»

– Каково это – быть академиком-орнитологом? Есть ли у Вас сейчас возможность наблюдать за птицами?

– Конечно. Я по-прежнему живу в лесу, на окраине Минска. На участке у меня таежный уголок, много растений, так что и птиц тоже много. Прямо над моим крыльцом гнездится снегирь. Не каждый орнитолог в своей жизни находит гнездо снегиря, а у меня он живет. Зеленушки, зарянки, трясогузки, два вида горихвосток, скворец, славка-завирушка, пестрый дятел, мухоловка-пеструшка, большая синица, лазоревка – всем находится место. На участке весной держатся крапивник и лесная завирушка. В жару купаться в ручей и попить слетается уйма видов – дрозды: черный, рябинник, певчий; дубоносы, зяблики, чижи, хохлатые синицы, гаички, клесты-еловики, теньковки – и это только завсегдатаи. В зоне видимости – гнездо ворона, в некоторые годы его занимает чеглок. Вокруг много соек, серых ворон, на туях гнездится сорока: всегда залетает с другой стороны дерева и думает, что я ее не вижу (смеется). Зимой на кормушке – дятлы, синицы, воробьи, поползни, московок много, когда урожай шишек у туй… Так что наблюдений за птицами хватает. Но это уже скорее не для науки, а для души.

– А специально выезжаете смотреть птиц?

– В последнее время очень редко: не так много времени, да и цели сейчас другие. Так что в некоторой степени завидую тем, кто может сорваться с места и ехать смотреть мандаринку или шилоклювку. Пока готовили определитель птиц, довелось немало поездить, ведь нужно было найти гнезда редких видов: и колонии щурок, и кедровку, и авдотку. Хотя иногда очень сложно найти гнездо и обычного вида. В прошлом году нашел гнездо зарянки у себя… в шкафу. Стоял на улице возле гаража, а птица среди молотков и проволоки наложила листьев и сделала гнездо. Я издалека на нее посматривал, чтобы не спугнуть. В итоге она так освоилась, что стала вылетать на меня и защищать свою территорию.

«Посмотрите в глаза птицы – и все по-другому…»

– Боюсь спросить: остались ли в Беларуси виды птиц, которых Михаил Никифоров не видел?

– Да, и немало. Особенно виды, которые залетали в последнее время: горная трясогузка, горный конек – их я не видел, хоть бердвотчеры ездили, смотрели. Трехпалой чайки не видел, плосконосого плавунчика. У нас недавно загнездилась северная бормотушка, ее не видел. Но вы знаете, я всех этих птиц себе очень хорошо представляю. Сейчас доступно много фото и видео.

– А можете посчитать, сколько видов птиц видели?

– Как-то давно считал, а потом перестал. Я не участвую в соревновании «кто увидит больше видов». У молодежи больше свободного времени, пусть наблюдают и становятся лидерами. Меня больше интересуют история развития орнитофауны, ископаемые виды. В общем, у меня свои рекорды в других сферах.

– Какую птицу можно сделать туристическим брендом Беларуси?

– Бренд нельзя просто придумать, он всегда требует раскрутки. На мой взгляд, у нас два вида: белый аист и глухарь. Это известные символы страны, которые вышли из народа: в Беларуси – ядро популяции аистов, а глухарь – символ лесов, которыми наша страна богата. Придумать новые птичьи бренды можно. Но вопрос в другом: нужно ли? Может достаточно и этих? Дополнением может быть птица года, которую АПБ выбирает. Это отличная идея, которую нужно развивать.

– Есть ли у вас любимая птица?

– Никогда не выделял для себя любимой. Все птицы совершенны. Каждая интересна своим качеством. Это только сначала кажется, что она серенькая и неприметная. А иногда достаточно посмотреть в ее глаза – и все по-другому…

Виктория Терешонок, специалист АПБ по связям с общественностью.
Фото – из архивов Михаила Никифорова



Стекла-убийцы

Птицы и антропогенные напасти



О стекла в нашей стране разбиваются более полутора миллиона птиц в год!

Зимой 2008 года 176 свиристелей разбились о стеклянный шумозащитный экран в Бресте. Но гораздо больше пернатых, натыкаясь на стекла, погибают поодиночке. Прошлой осенью у корпуса научного отдела Березинского биосферного заповедника я с коллегами нашел полуживого снегиря, ударившегося о стекло. Особенно много птиц погибает во время весенней и осенней миграции, когда они оказываются в непривычной для себя среде и встречают созданные человеком невидимые стеклянные «ловушки» – окна и прозрачные шумозащитные экраны у дорог. Однако строительные нормы в нашей стране пока не предусматривают даже элементарных мер по защите пернатых.

Впрочем, в Беларуси, где проводились исследования о влиянии линий электропередач и автотранспорта на гибель птиц, до сих пор никто особо не задумывался о масштабах проблемы, которую создают прозрачные поверхности. В США по результатам 23 местных исследований специалисты сделали вывод, что о стекла ежегодно разбивается насмерть от 365 до 988 миллионов птиц (2014). Это до 10 % численности всех птиц США. Здания высотой 1–3 этажа «убивают» 44 % птиц, 2–11-этажные – около 56 %, небоскребы – меньше 1 %. На одно невысокое здание приходится гибель всего нескольких птиц, тогда как на один небоскреб – в среднем 24 особей. Стекла – вторые по успешности убийцы после домашних котов, которые в США, согласно последним исследованиям (2013), убивают от 1,3 до 4 млрд. птиц ежегодно. Охота, столкновения с транспортом или ветряками не стоят даже рядом.

В окно моей квартиры на третьем этаже в пятиэтажном доме только однажды на полной скорости врезался сизый голубь. От него на стекле остался странный дымчатый силуэт. Птица отлетела от здания, но вряд ли она выживет после такого удара. Британские орнитологи подсчитали, что треть птиц, ударившихся об окна, погибает.

Ежегодно, разбившись о стекла, погибает примерно столько птиц, сколько зданий в стране, считают орнитологи из Швейцарии. Как сообщает специалист Национального кадастрового агентства Владимир Немик, в Беларуси сейчас зарегистрировано 1 млн. 668 тысяч зданий. При подсчете по швейцарской методике получается, что о стекла в нашей стране разбиваются более полутора миллиона птиц в год! Тем не менее в Беларуси пока не применяются строительные нормы по защите пернатых от столкновений.

Певчий дрозд весной разбился о ничем не примечательное окно офиса на третьем этаже в здании Белгидромета в Минске. Тушки разбившихся о стекла певчих птиц лежали вдоль стеклянной галереи на крыше первого этажа Минского международного аэропорта. Большинство погибших или раненых птиц под зданиями подбираются бродячими собаками или рано утром собираются уборщиками. Все же статистика по разным зданиям и сезонам в Беларуси была бы интересной и позволила бы АПБ выступить не с голословными заявлениями. Хорошо бы собрать ее на специальном сайте АПБ florafauna.by, нужно только отмечать правильно причину гибели птицы, тем более, что сфотографировать ее для определения специалистами не составит труда.

В природе не существует ничего похожего на стекло, и птицам сложно научиться избегать этого невидимого врага. Их обманывают зеркальные поверхности, в которых отражаются кусты и деревья. Очень часто птицы натыкаются на стекла, через которые видны какие-либо зеленые укрытия или небо.


Гостиница № 4 в национальном парке «Беловежская пуща» с «привлекательными» для птиц зеркальными стеклами


Беспощадные стекла музея собирают с птиц свою «дань»

Между тем относительно недавно в Национальном парке «Беловежская пуща» сделали зеркальной одну из наружных стен нового музея. Сейчас возле этой стены регулярно можно увидеть трупики птиц. Непонятно, зачем ради мнимой «красоты» создавать смертельные ловушки для пернатых, да еще на особо охраняемой природной территории?

Что делать?

Наблюдения в Смитсоновском национальном зоопарке в Вашингтоне показали, что размещение на стеклах вольеров наклеек-птиц значительно уменьшает количество гибнущих пернатых. На Западе такие наклейки используются при строительстве зданий уже не одно десятилетие. В Беларуси элементарными птицезащитными устройствами снабжен разве что шумозащитный экран на минской кольцевой дороге в районе Жданович – на каждом стеклышке наклеен черный силуэт птицы. В принципе неважно, что наклеено на стекло – силуэт хищника, вороны или трактора – любая наклейка делает стекло видимым для птиц и спасает их от гибели. Непрозрачные шумозащитные экраны (ул. Подольная в Гродно) также безопасны для птиц.

Швейцарские орнитологи рекомендуют для защиты птиц клеить на стекла не черные изображения хищников, которые плохо видны под углом, а желто-красные. Стоимость таких наклеек – примерно 1 доллар за 6 штук. В Беларуси наклеек-силуэтов в продаже пока вообще нет, но их можно изготовить самостоятельно.

Швейцарский орнитологический институт совместно со Швейцарским союзом охраны с 1997 года постоянно информируют о проблеме гибели птиц строительные организации (особенно ответственных за дорожное и гражданское строительство), архитекторов и застройщиков. В результате этой кампании на всех шумозащитных стеклянных экранах вдоль швейцарских дорог наклеена специальная пленка с полосами, отражающими и поглощающими ультрафиолет. Они невидимы для человека, но весьма заметны для птиц. Такие полосы можно нанести или заводским способом, или с помощью специального скотча. Все желающие получают специальные буклеты об оптимизации потенциально опасных для птиц построек. Сейчас застройщики при планировании стеклянных конструкций частенько обращаются к орнитологам за советом, так как использование тех или иных методов защиты птиц часто зависит от конкретной ситуации.

Швейцарцы, например, обнаружили, что шумозащитные экраны с прилегающими деревьями и кустами «убивали» в 4 раза больше птиц, чем расположенные там, где таких «приманок» не было. Рекомендуется вообще не сажать кусты и деревья возле крупных стеклянных панелей. Желательно также убрать растения от окна внутри помещений, чтобы птицы не приняли их за привлекательную среду обитания.

В ранге закона

В Сан-Франциско были приняты первые городские стандарты по безопасному для птиц дизайну фасадов зданий. Этот законодательный акт был утвержден в октябре 2011 года и обязателен к применению в районах, где угроза гибели птиц является очень высокой, для других районов закон является рекомендательным. Стандарту сопутствуют критерии оценки безопасности проектов для птиц.

Сейчас на Западе целью ставят включение птицезащитного подхода в определение «зеленого» здания и последующее создание специальных строительных норм по уменьшению опасности столкновения. Такие стандарты будут поощрять инновационные проекты архитекторов и стимулировать рост спроса на новые продукты, такие как стекло, которое видимо птицам, но не людям – возможно, это и будет идеальным высокотехнологичным решением по предотвращению столкновений птиц с окнами.

Включенная ночная подсветка зданий тоже привлекает и дезориентирует ночных мигрантов. Сейчас многие американские и европейские города, принимая участие в программе по уменьшению гибели птиц, пропагандируют отключение или сильное приглушение ночной подсветки в административных и офисных зданиях в период миграции, что помогает не только спасти птиц, но и сэкономить электроэнергию. В штате Миннесота местный закон требует, чтобы с 15 марта по 31 мая и с 15 августа по 31 октября каждый год пользователи государственных или арендованных государством зданий уменьшали угрозу для мигрирующих птиц, выключая огни здания между полуночью и рассветом до степени, необходимой для нормальной эксплуатации зданий.

Миллионы птиц могут быть спасены ежегодно. Для этого необходимо осуществить простые меры: уменьшить ночное освещение в высоких зданиях, отрегулировать внешнее и внутреннее освещение, подправить ландшафт около застройки, прикрепить на стекла наклейки, переводные картинки, полоски (не более 10 см пробел при вертикальном размещении полос и не более 5 см при горизонтальном) или специальную пленку, нанести рисунок краской, т.е. сделать окна более заметными для птиц, сделать внешние ставни или закрыть окна сеткой. Кормушки и купальни для диких птиц должны располагаться не далее 1 м от вашего окна, иначе увеличивается вероятность, что, разогнавшись, птица разобьется о стекло. Если при строительстве окна поставить отклоненными от вертикали на 20–40 градусов, они станут безопасными для птиц.

Офисные работники и жители жилых домов могут попросить комендантов зданий выключить огни декоративной подсветки и ночные прожекторы, особенно во время сезонов миграции. Если Вы живете или работаете на верхних этажах здания, оставляйте свои жалюзи закрытыми на ночь.

А тем временем в офис АПБ осенью в отдельные дни приносят по нескольку подраненных лесных куликов – вальдшнепов – ночных мигрантов, чаще всего подобранных недалеко от центральных улиц столицы.

Александр Винчевский, фото автора и архив АПБ


Гнездо смешанной пары коршунов


Гибридный слеток

Красное и черное

В жаркий июльский день раздался звонок мобильного. Беспокоил меня друг и коллега – директор Зоологического музея БГУ Александр Писаненко.

– Геннадий! Я на даче возле небольшого озера, по Брестскому шоссе. Ловлю стрекоз (Александр – дипломированный энтомолог с многолетним стажем – прим. авт.), а красный коршун с поверхности озера хватает снулую рыбу!

Надо сказать, что по Беларуси проходит граница ареала этого вида. Мне за почти 30 лет полевых исследований всего лишь раз посчастливилось увидеть красного коршуна на Витебщине. Было это лет 12 назад.

Сомневаться в том, что Александр определил птицу правильно, не приходилось: во время экспедиций на Алтай, где черный коршун – фоновый вид, ему с утра до вечера приходилось видеть десятки этих хищников. Однако на всякий случай я уточнил:

– Саша, ты уверен, что видишь красного коршуна?

– Да, на 100 %.

– Давай я в конце недели подъеду, и попытаемся проследить, куда он летает. Если повезет, найдем гнездо.

Пятница. Прихватив в электричку велосипед, выезжаю на место. Просидели пару часов возле озера, и наконец увидели коршуна. Он пролетел низко над водой, быстро выхватил рыбу, а потом поднялся над деревьями и направился вдоль речки Уса.

Вооружившись картой, мы с коллегой стали определять наиболее вероятный для гнездования участок. Километрах в 9–10 от озера – старый ольшаник, где, по всей вероятности, и мог гнездиться коршун.

На следующий день на велосипедах мы добрались до широкой поймы. Я расположился на задвижке мелиоративного канала, а Александр поехал дальше, в сторону ольшаника. За день нам удалось несколько раз проследить коршуна, приносящего корм птенцам. Участок, куда каждый раз спускалась птица, представлял собой затопленный бобрами смешанный лес.

Вечером, когда мы уже возвращались на дачу по бетонному шоссе, с небольшого расстояния наблюдали черного коршуна, который летел по направлению к предполагаемому гнездовому участку.

Интересно, может эти два родственных вида живут неподалеку друг от друга? На следующий день мы с утра спрятали велосипеды в лесу и по пояс в воде двинулись в центр участка, где, по моим расчетам, было гнездо.


В вопросах интерьера гнезда коршуны не изменяют своим привычкам

Вскоре мы заметили сидящего на сухой осине черного коршуна, слетевшего при нашем приближении. В метрах пятнадцати от присады, на березе, обнаружилось и гнездо. Оно было завалено всевозможными остатками пищи, что свидетельствовало об успешном гнездовании.

К нашему сожалению, птенцы уже вылетели. Александру удалось сфотографировать самку красного коршуна, а мне – самца черного, которые, несомненно, составляли брачную пару. Подобные случаи образования смешанных пар отмечались раньше в Швейцарии, Германии и Чехии. В Беларуси это редкое явление регистрируется впервые.

Мне очень хотелось сфотографировать птенцов, посмотреть, на кого они больше похожи. И вот через неделю мы опять посетили гнездо. Осторожно приблизившись, с близкого расстояния сняли слетка. С нетерпением ждем этого сезона: вдруг нам опять повезет, и коршуны вернутся на старое гнездовье.

Геннадий Миндлин, почетный член АПБ, фото автора



Грайна – любоў мая

Грайна вясной

Напэўна, у многіх з нас ёсць месцы, куды заўсёды цягне вяртацца зноў і зноў. Адным з такіх месцаў стала для мяне балота Грайна. Чаму так адбылося, я і распавяду ніжэй.

Гэтая гісторыя пачалася пасля таго, як у Беларусі пад канец 1990-х пачалі дэталёва вывучаць вяртлявую чаротаўку, невялікую вераб'іную птушку, якая, на жаль, знікае амаль па ўсім арэале. На працягу даследаванняў высветлілася, што амаль палова глабальнай папуляцыі чаротавак гняздуецца ў нашай краіне, таму менавіта мы адказныя за захаванне гэтага віду, які знікае. З вяртлявай чаротаўкай звязанае і заснаванне АПБ, не дзіва, што яна заканамерна трапіла і на лагатып нашай арганізацыі.

Галоўная праблема вяртлявай чаротаўкі тоіцца ў тым, што гняздуецца яна выключна на нізінных балотах, амаль паўсюдна асушаных, ды і то не на ўсіх, а толькі там, дзе расце асака некалькіх адпаведных відаў. Вывучаючы створаныя яшчэ ў савецкі час геабатанічныя мапы, мы высветлілі, што балота такога тыпу павінна было захавацца і ў 30 кіламетрах ад Гродна паміж вёскамі Грайна і Ярмолічы ў Бераставіцкім раёне. Так яно ў выніку і сталася – у пойме ракі Свіслач на невялікім нізінным балоце была знойдзена лакальная папуляцыя вяртлявай чаротаўкі. Мясцовай назвы ў гэтага балота не было, таму мы адразу сталі называць яго “Грайна”, – паводле назвы маленькай вёсачкі, якая знаходзілася побач.

У 2003 годзе згодна з рашэннем Бераставіцкага райвыканкама на аснове рэкамендацый АПБ з мэтай захавання біятопа – месца гнездавання глабальна пагражаемага віду, вяртлявай чаротаўкі, быў створаны біялагічны (арніталагічны) заказнік мясцовага значэння “Свіслач” плошчай 2317 га. Балота і навакольныя землі плошчай амаль у 3200 га атрымалі статус ТВП – тэрыторыі, важнай для птушак, міжнароднай значнасці. Праз балота праходзіць аўтатраса Гродна – Вялікая Бераставіца, якая дзеліць яго на дзве няроўныя часткі, большая з іх адміністрацыйна адносіцца да Бераставіцкага, а меншая – да Гродзенскага раёна. На жаль, заказнік быў створаны толькі на Бераставіцкай частцы балота, але часам тое, што зроблена не да канца, дае магчымасць зрабіць больш і лепш. Так атрымалася і ў гэтым выпадку.

Мы пачалі час ад часу наведваць балота і яго жыхароў, а праз тры гады правялі тут поўныя падлікі вяртлявых чаротавак. Падлікі, праведзеныя ў 2006−2010 гадах, паказалі, што колькасць самцоў гэтага віду, якія спяваюць на балоце, катастрафічна памяншаецца: з 80 да амаль 30 за чатыры гады. Хто ўдзельнічаў у падобных падліках, ведае, што справа гэта няпростая: пачынаюцца яны за гадзіну да заходу сонца і заканчваюцца праз гадзіну пасля. Па нізінным балоце з яго купінамі асакі і вадой да калена не пабяжыш, увагу ад птушак адцягваюць шматлікія камары ды мошкі. Таму падлікоўцы ў высокіх гумавых ботах рухаюцца з хуткасцю каля 1 км у гадзіну, дзе-нідзе шукаюць брод праз каналы, перапоўненыя вадой, і стараюцца трымацца на адлегласці не больш за 50 м адзін ад аднаго, каб не прапусціць ніводнага спеўнага самца і адзначыць усіх птушак на імправізаваных мапах з дапамогай GPS-навігатараў.

Праз тое, што балота насамрэч не такое ўжо і маленькае, як выглядае на мапе, а яшчэ таму, што дасведчаных у гэтай справе людзей у Гродна можна пералічыць на пальцах, прыходзілася вяртацца на балота па 5−6 разоў за сезон. Аднойчы падчас правядзення падлікаў і адбылася адна з самых смешных і незвычайных гісторый у нашай сям'і.

Мы з маёй жонкай Аленай былі вымушаны ўзяць з сабой на балота нашага малога сына Валодзю, бо яго ў той вечар не было з кім пакінуць дома. Прывёз нас і калег-падлікоўцаў на балота наш сябар Паша. Мы як маглі растлумачылі сыну, што будзем рабіць на балоце і калі прыкладна вернемся. Аднак для яго час цягнуўся значна павольней, чым для нас. Прайшло больш за дзве гадзіны, пачало змяркацца, а нас усё не было. Валодзя спалохаўся, але выгляду не падаў і прапанаваў “дзядзю Пашы” … усынавіць яго! Малы пачаў тлумачыць адзінаму даросламу чалавеку, які знаходзіўся побач, што ў якасці бонусу ён зможа атрымаць яшчэ кватэру і камп'ютар! А праз некалькі хвілін, мокрыя ад поту і падзенняў у балоце, вярнуліся да машыны і мы. Падстава для ўсынаўлення знікла, а на тлумачэнні Валодзі пра тое, што мы відавочна прапалі ў балоце і ён страціў надзею нас дачакацца, мы не ведалі, што рабіць, − таму і плакалі, і смяяліся адначасова…

Як гэта звычайна бывае з ТВП, яны выяўляюцца важнымі не толькі для некаторых, няхай і вельмі рэдкіх, відаў птушак. Мы ўсё больш даведваліся пра балота і навакольныя мясціны, спіс адзначаных тут відаў птушак паступова перавалiў за сотню, сярод рэдкіх відаў, акрамя вяртлявай чаротаўкі, тут гняздуюцца вялікі грыцук, балотная сава, чапля-бугай, шэры журавель, тысячамі і дзясяткамі тысяч прыпыняюцца вясной гусі, баталёны, кнігаўкі, залацістыя сеўкі і іншыя кулікі і качкі многіх



Балота з'яўляецца важным месцам адпачынку для міграцыйных вадаплаўных птушак…

відаў. А ў 2007 годзе нашы калегі-батанікі пад кіраўніцтвам Алега Созінава дакладна даследавалі раслінны свет Грайны і знайшлі тут 263 віды сасудзістых раслін, з якіх дзягіль балотны і сіела прамастаячая занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Мы ўвесь час думалі, як далучыць да заказніка не менш каштоўную Гродзенскую частку балота, але ўвосень 2012 года сітуацыя нечакана змянілася. На рацэ Нёман увялі ў дзеянне гідраэлектрастанцыю, дзякуючы чаму падняўся ўзровень вады і ў Свіслачы, якая ўпадае ў Нёман крыху вышэй за плаціну ГЭС.

Свіслач (нёманская) – незвычайная рака. Недалёка ад яе цяперашняй поймы ў вёсцы Мацеевічы былі знойдзены рэшткі стаянкі старажытных людзей так званай “культуры шарападобных амфар”, якая прыкладна 5 тысяч гадоў таму была распаўсюджана па ўсёй Еўропе. Сама рака пачынаецца ў Беларусі каля горада Свіслач, бяжыць у бок Польшчы і некалькі кіламетраў пятляе па мяжы з гэтай краінай. Ад мяжы і да балота Грайна рака выглядае як шырокі канал, а ўжо далей аж да самага вусця зноў цячэ ў сваёй натуральнай даліне.

Нашы даследаванні паказалі, што наяўны заказнік варта пашыраць на ўсю натуральную пойму Свіслачы, дадаткова ўключыўшы ў яго новаўтвораныя вадасховішчы – часткова на Нёмане каля вусця Свіслачы і непасрэдна ўздоўж яе ў наваколлі вёсак Карозічы і Рудавіцы. Наша прапанова трапіла ў дзяржаўныя планы і сёлета павінна ажыццявіцца – тут паўстане новы заказнік, агульная плошча якога складзе 5500 га.

Каб падрыхтаваць абгрунтаванне пашырэння заказніка, мы пачалі, дзякуючы праектам, падтрыманым REC (Рэгіянальным экалагічным цэнтрам для краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы), штотыдзень выязджаць на балота і ў даліну Свіслачы з вадасховішчамі.

Падчас гэтых паездак на працягу двух апошніх гадоў нам удалося адзначыць тут даўгахвостага паморніка (трэцяя рэгістрацыя ў Беларусі), шыладзюбку, хадулачніка, куліка-стучка, чырвонаносых ныркоў, даўганосых савукоў, чапляў-квакваў, белашчокіх казарак, пярэстую качку, чырвонага каршуна, ныркоў-свіркоў і плёсавак, шчурак-пчалаедак, горных чачотак, рагатых жаўрукоў, сняжурак, малых чаек, сокалаў-падарожнікаў і дрымлюкоў. А ў цёплыя зімы тут сталі зімаваць не толькі



Сведка ледніковай эпохі

каля сотні лебедзяў-клікуноў, але таксама і малыя лебедзі, гусі: шэрыя і гуменніцы, а таксама шэрыя жураўлі.

Каб падзяліцца з мясцовымі жыхарамі інфармацыяй пра прыродную каштоўнасць гэтых мясцін, мы не толькі выпусцілі і распаўсюдзілі тут плакаты, налепкі і буклеты, але і ўрачыста – з удзелам мясцовых уладаў і прадстаўнікоў органаў аховы прыроды – адкрылі ў самых цікавых і наведваемых людзьмі месцах інфармацыйныя шыльды пра мясцовых птушак і АПБ.

З гэтай вясны на ўсёй тэрыторыі будучага заказніка забаронена веснавое паляванне, што, зразумела, толькі павялічвае прывабнасць тэрыторыі для сотняў тысяч птушак, што мігруюць праз даліну Свіслачы.

На жаль, не адбылося і без негатыўных зменаў: у апошнія тры гады высокая вада ў балоце Грайна стаіць



…і адным з нешматлікіх месцаў гнездавання вяртлявай чаротаўкі

увесь год, што пачало ўплываць на відавы склад не толькі расліннасці, але і птушак. Тут з'явілася каланіяльнае пасяленне чаек-рыбачак, да іх пацягнуліся чорнашыйныя і шэрашчокія коўры. Напэўна, колькасць вяртлявых чаротавак яшчэ больш зменшылася, бо самкі гэтага віду будуюць гнёзды ў аснове асаковых купін. І калі высокая вада стаіць падчас сезону гнездавання ў траўні-ліпені, птушкі могуць увогуле не прыпыняцца ў такіх месцах. Здаецца, зніклі на гнездаванні і вялікія грыцукі.

Але пра гэта, як і пра прычыны стала высокага ўзроўню вады, у выніку чаго балота ператварылася ў возера, мы даведаемся толькі ў другой палове лета, пасля таго як нашы сябры-геадэзісты правядуць свае даследаванні, а мы падлічым спеўных самцоў вяртлявай чаротаўкі…

Дзмітры Вінчэўскі,
Рэдактар сайта “Птушкі штодня” (www.birdwatch.by),
Гродна, фота аўтара



85 “Рэдкіх птушак”

На гэтых старонках гаворка пойдзе не пра птушак, а пра людзей. Людзей, якія з'яўляюцца сябрамі клуба АПБ “Рэдкая птушка”. Кожны год іх сяброўскі ўзнос перавышае ўзносы астатніх. Навошта яны плацяць болей?

З гісторыі
Катэгорыя “Рэдкая птушка” з'явілася ў АПБ у 2002 годзе і пачыналася з некалькіх чалавек. На травень 2015 колькасць удзельнікаў складае ўжо 85 чалавек.

Чаму варта быць “Рэдкай птушкай”?
– вы падтрымліваеце прыродаахоўную дзейнасць АПБ. Ваш узнос цалкам кампенсуе кошт матэрыялаў, а астатнія грошы ідуць на карысныя для птушак справы!
– вы маеце магчымасць далучыцца да адмысловых экскурсій, якія АПБ ладзіць спецыяльна для сяброў клуба;
– вы атрымліваеце значак з выявай птушкі, які можна з гонарам насіць і такім чынам дэманстраваць сваю прыналежнасць да АПБ і свой клопат пра дзікую прыроду.

На што ідуць грошы “Рэдкіх птушак”?
У 2014 годзе грошы ўдзельнікаў “Рэдкай птушкі” пайшлі на падтрымку валанцёрскіх летнікаў на Тураўскім лузе і на праект спадарожнікавага сачэння за зязюлямі.
У 2015 частка сродкаў выкарыстаная на маніторынг гнездавых скрыняў для птушкі года – вушатай савы.

Куды “лятаюць” сябры клуба?
“Рэдкая птушка” ўжо шукала птушак на рыбгасах, у лясах і нават на сметніках, выпраўлялася на кар'еры ў пошуках шчурак-пчалаедак , праходзіла экалагічную сцежку адзінага ў краіне запаведніка – Бярэзінскага біясфернага. Сёлета мы ўдала выправіліся на пошукі вушатай савы. Яшчэ адна экскурсія (пакуль сакрэтная) запланаваная на восень. Далучайцеся – паедзем разам!

Як стаць “Рэдкай птушкай”?
Далучыцца даволі проста: на старонцы www.ptushki.org/anketa запоўніце анкету сябра і пазначце катэгорыю “Рэдкая птушка”.
Пасля гэтага аплаціце ўзнос – і вы ўжо сябра клуба!

Як сябру АПБ перавесціся ў катэгорыю РП?
Напішыце нам на адрас **info@ptushki.org** ці патэлефануйце **+375 17 2630613** і паведаміце пра жаданне змяніць катэгорыю сяброўства.
Мы скажам неабходную суму, якую трэба даплаціць да вашага мінулага ўзносу.
Пасля гэтага вас перавядуць у РП!
Важна: кожны год перад аплатай сяброўскага ўзносу можна самастойна змяніць катэгорыю.

“Рэдкая птушка” – падарунак на народзіны ці вяселле!
Цікава, што апошнім часам усё больш людзей набывае сяброўства ў клубе ў якасці падарункаў сваім сябрам. Гэта арыгінальны і сапраўдны сюрпрыз для чалавека. Потым большасць людзей працягвае сяброўства і на наступны год яны самастойна аплачваюць узносы.

Вікторыя Церашонак,
спецыяліст АПБ па сувязях з грамадскасцю.
Фота – Руслан Завадзіч

Дзе жывуць “Рэдкія птушкі”?

Мінская вобл.
Брэсцкая вобл.
Гродзенская вобл.
Гомельская вобл.
Віцебская вобл.
Магілёўская вобл.

Я “Рэдкая птушка”!

Людзі прыходзяць да нас з розных прычын. Адны хочуць трапіць на экскурсіі, другія – больш даведацца пра птушак, трэція – патраціць грошы на нешта карыснае, чацвёртыя – кампенсаваць такім чынам сваю экалагічную пасіўнасць. Усе яны могуць з гонарам сказаць: «Я “Рэдкая птушка”».



Настасся Кузьміч, культурны арганізатар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі:
– Я вырашыла стаць карысным сябрам АПБ і таму абрала “Рэдкую птушку”, бо ведаю, што толькі ўзнос з такога сяброўства здольны фінансава падтрымаць ахову птушак нашай краіны. Я была валанцёрам на двух фестывалях АПБ і назірала за камандай, якая працуе ў гэтай арганізацыі. Людзі натхнёныя, цікавыя, прыгожыя. Усе дзяўчаты з “птушкавымі” завушніцамі ды караламі, а ў іх заплечніках ці торбах – абавязкова бінокль, каб назіраць за ўлюбёнымі крылатымі паўсюль. Яны з натхненнем распавядаюць пра таленавітых арнітолагаў, нібы пра галівудскіх зорак. Карацей, цяпер я “Рэдкая птушка” і адчуваю сябе часткай чагосьці выдатнага!



Яўген Лабанаў, дырэктар экалагічнай арганізацыі “Цэнтр экалагічных рашэнняў”:
– Ахова беларускай прыроды – справа тых людзей, якія жывуць на гэтай зямлі. Нельга сядзець і чакаць, пакуль хтосьці зробіць гэта за нас: варта клапаціцца самім, а не разлічваць на іншых. Важна падтрымліваць экалагічныя ініцыятывы і арганізацыі, якія працуюць у гэтым кірунку. Маё сяброўства з АПБ – гэта мой асабісты ўнёсак у працу арганізацыі, дзейнасць якой я лічу важнай.



Віктар Кулік, кандыдат фізічных навук:
– Я зарэгістраваўся ў Клуб-200, пачаў назіраць за птушкамі, і натуральна “падсеў” на бердуотчынг! Удзел у спаборніцтвах падштурхнуў далучыцца да “Рэдкай птушкі”. Дзякуючы экскурсіям я магу больш шчыльна камунікаваць з арнітолагамі, атрымліваць новыя веды і бачыць новыя куткі Беларусі. Канешне, да Сямёна Левага і Дзяніса Кіцеля мне далёка, але ўсяму свой час. У гэтым годзе падцягну веды па куліках: прозвішча матывуе!



Галіна Шаціла, праектавальнік:
– На добрую справу заўсёды хочацца даць болей. Да таго ж, сума ў любым выпадку невялікая. Не заўсёды магу штосьці зрабіць для птушак, мая прафесія не звязаная з арніталогіяй. Але калі можна дапамагчы праз “Рэдкую птушку” – з радасцю карыстаюся такой магчымасцю.



Анатоль Кароткін, прадпрымальнік:
– Восенню прыходзіў у офіс пазнаёміцца з працай АПБ. Натхніўся і адразу стаў “Рэдкай птушкай”. Ведаеце, прыроду вельмі люблю. Па маладосці бываў і на паляванні, і на рыбалках. А зараз хачу толькі назіраць, замест стрэльбаў – бінокль ды фотаапарат. Птушак люблю: падкормліваю, будую домікі, у гэтым годзе замахнуўся паставіць платформу для буслоў. Буду далучаць да АПБ дзяцей і ўнукаў!



Джон Росман, дырэктар фонду “Экалагічны транспарт”:
– Я падтрымліваю АПБ і заўсёды захапляюся тым, што робіць арганізацыя. Насамрэч, калі я запаўняў анкету на сяброўства ў АПБ, не звярнуў асаблівай увагі на катэгорыю. І так выпадкова атрымалася, што я стаў “Рэдкай птушкай”. Бачыце, якая ўдача! Ужо 3 гады стараюся далучацца да экскурсій, таксама быў на Ельні, на патруляванні ласосяў, штогод прыходжу на з'езды. Развітвацца з АПБ не планую!

Нашы летнія суседзі

На дварэ першая палова лета, час, які многія праводзяць на сваіх дачных надзелах, даглядаючы гарод, кветнік або калекцыю дэкаратыўных хмызнякоў. Зразумела, што ваша дачнае жыццё не абыйдзецца без сустрэч з птушкамі, якія абралі ваш сад або гарод у якасці свайго гнездавога ўчастка. Спадзяемся, што яны не толькі будуць абараняць вашы расліны ад шкоднікаў сельскай гаспадаркі, але і прынясуць вам шмат цікавых і прыемных хвілін.

Гэты выпуск вызначальніка дапаможа вам больш грунтоўна пазнаёміцца з вашымі пярнатымі суседзямі, ну, а калі вы выпадкова натрапіце на іх гняздо, проста пакіньце яго ў спакоі, і птушкі, нягледзячы на вашу прысутнасць, паспяхова выведуць і выхаваюць птушанят.

Вясковая ластаўка ♂ мал.

Леска-завірушка

Сіняя сініца

Рудахвостка-чарнушка ♂ ♀

Палявы верабей

Звычайная падкаменка ♂ ♀ мал.

Еўрапейскі ўюрок ♂ ♀ мал.

Белая пліска ♀ ♂

Берасцянка ♀ ♂

Звычайная рудахвостка ♀ ♂

Чорны дрозд ♂ ♀ мал.

Пярэстая валасяніца ♀ ♂

Шэрая валасяніца

Малінаўка мал. ♂

Звычайная зелянушка мал. ♂ ♀

Канаплянка ♀ ♂

Вялікая сініца ♂ мал.

Чорнагаловы шчыгел мал. ♂

Як я адкрыў і “закрыў” новы від савы

Нататкі беларускага заолага ў Амазоніі.



Я ляжу на маім вузкім ложку і слухаю дождж, шум маленькіх частых кропляў па шыферным даху невялікай шчытавой хацінкі, дамка накшталт “палат” піянерскіх лагераў майго дзяцінства, але маленькага, на два жыхары, і з сеткай замест шкла ў вокнах. Час – 20 хвілін да шостай раніцы, месца – абшары нацыянальнага парка Ясуні ў эквадорскай Амазоніі, біястанцыя на беразе Рыа Ціпуціні (як кпіць мой маскоўскі сябра: “Ты Путина видел?”), я – чалец маленькай экспедыцыі невялікага натуральна-гістарычнага музея, таксанаміст-энтамолаг з даволі багатым арніталагічным мінулым. За вокнамі – прыцемкі (на экватары ўсход заўсёды а шостай, да таго ж – хмарна і густы высокі лес вакол), цішыня парушаецца толькі шумам дажджу ды ўпартым гуканнем сплюшкі Otus wilsonii, якое гучыць амаль неадрозна ад голасу калматаногага сыча, асабліва для мяне, які не чуў таго сыча гадоў пяць, калі не восем. Бясконцы стракат цвіркуноў ды маленькіх жабак – натуральная частка цішыні, здаецца, для любога, хто правёў хоць колькі дзён у трапічным лесе.

